# Ахова птушак Бацькаўшчыны

www.ptushki.org

ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ | 2 (57) - 2015



"Гатэль" для жукоў на лецішчы ці сядзібе? Лёгка! 2-3

Дзе Віктар? 4

Птушкі і закон 4


## Захавальнікі ТВП: ад Ельні да Сажа, ад Выганашчаў да Гронава



**Вольга Лукшыц**, менеджар праекта "Прырода важная для ўсіх":

Шаноўныя сябры, вітаем!

З радасцю дзелімся з вамі апошнімі навінамі вялікага і "агульнабеларускага" праекта "Прырода важная для ўсіх", які рэалізуецца пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза і аб'ядноўвае 10 тэрыторый, важных для птушак (ТВП). Лета, як звычайна, было для АПБ гарачым. І гэта не толькі метафара, але і стан надвор'я. Гарачыня напаткала валанцёраў на Тураўскім лузе ў час расчысткі ТВП ад хмызнякоў. Радуе, што нарэшце было шмат удзельнікаў з Гомельшчыны і самога Турава. Дапамагаць прыехаў і студэнт з Нігерыі – краіны, дзе нашы кулікі зімуюць. Дзясятак валанцёраў разам расчысцілі дзесяць гектараў лугу на такавішчы дубальтаў. Чакаем вясной птушак на падрыхтаваным месцы!

Спёка не дала правесці традыцыйныя летнікі на Ельні з прычыны працяглай забароны на наведванне лясоў. На жаль, у жніўні на Ельні ўпершыню за 13 год адбыўся пажар. Яго хутка выявілі і патушылі, згарэла ўсяго 150 га. Пабудаваныя АПБ плаціны спрыялі таму, што пажар не перайшоў углыб, а застаўся верхавым. Як распавялі захавальнікі ТВП, журавіны добра ўрадзілі каля каналаў, перакрытых плацінамі. Значыць, не дарма працавалі ў свой час валанцёры!

Гэтым летам дзякуючы дзейнасці захавальніка ТВП "Выганашчанскія балоты" Аляксандра Іванова быў праведзены штогадовы маніторынг барадатых кугакавак: наш сябра праверыў каля 30 гнёздаў гэтай птушкі з Чырвонай кнігі і адзначыў адно парушэнне – высечку каля гнязда. Інфармацыя перададзеная землекарыстальніку, каб прыняць меры. Захавальнікі ТВП "Пойма ракі Сож" здзейснілі дзве экспедыцыі (вясной і летам) і даследавалі тэрыторыю. На ТВП "Гронава" сівагракі занялі дзве штучныя дуплянкі.



Здымак атрыманы з аўтаматычнай камеры, усталяванай пры падтрымцы Ruffled Small Grant

Нядаўна мы атрымалі радасныя навіны ад Мінпрыроды: у нацыянальным конкурсе на найлепшага грамадскага эколага ў 2015 годзе пераможцам стаў Валерый Кавалёнак з Шаркаўшчыны, даўні сябра АПБ і захавальнік ТВП "Балота Ельня". На другім месцы ў сёлетнім конкурсе – Ірына Бірына-Паўлава, кіраўнік клуба "Крылаты дазор" з Мінска. Віншуем сяброў! Важна, што такія людзі разам з намі. Дарэчы, у 2014 найлепшым грамадскім эколагам у краіне была прызнаная Марына Фёдарава – таксама захавальнік ТВП "Балота Ельня", кіраўнік клуба АПБ "Крылаты дазор" з Шаркаўшчыны.

Пачатак восені адзначыўся значнай падзеяй – мы выдалі каталог ТВП Беларусі. 150 старонак кнігі аб'яднялі шматгадовую працу каманды даследчыкаў па выяўленні, маніторынгу і ахове ТВП у Беларусі.

Сяброў АПБ і захавальнікаў ТВП чакае не менш насычаная восень. Сачыце за абвесткамі і далучайцеся да нашых мерапрыемстваў. Разам для прыроды і людзей!

## 3–4 кастрычніка – EuroBirdwatch-2015!



**Карына Салавей**, каардынатар Еўрапейскіх дзён назірання за птушкамі ў Беларусі:

– Сябры, у чарговы раз запрашаем вас паглядзець на птушак восенню падчас "Еўрапейскіх дзён назірання за птушкамі"! Гэта штогадовая акцыя аб'ядноўвае аматараў птушак з 40 краін Еўропы і Цэнтральнай Азіі. У гэтыя два дні дзясяткі тысяч людзей адначасова выходзяць на двор ці выбіраюцца на прыроду, каб паназіраць за прыгажосцю крылатых сяброў, а таксама вызначыць і падлічыць птушак. У гэтым годзе EuroBirdwatch адбудзецца ў 22-і раз.

Удзел – гэта шанец для вас назіраць прыродны цуд, восеньскую міграцыю птушак, і, магчыма, зрабіць сваё ўласнае адкрыццё ў выглядзе цікавай і рэдкай птушынай сустрэчы.

У 2014 годзе Беларусь заняла 5-е месца па колькасці ўдзельнікаў. Самымі распаўсюджанымі птушкамі былі грак, каўка, шпак. "Разынкамі" сталі адзначаныя ў Беларусі чубаты нырок у ваколіцах Навалукомля, малы лебедзь у аграгарадку Германавічы, вялікая чарада лебедзя-клікуна (25 асобін) на рыбгасе "Волма". Там жа назіралі вялікага кулёна – від, які адлятае на поўдзень раней і з'яўляецца рэдкім госцем кастрычніка.

Пад час EuroBirdwatch-2014 у Еўропе за восеньскай міграцыяй назіралі больш за 23 000 аматараў птушак. За гэты час удалося пабачыць каля 2,5 млн птушак. На першым месцы па колькасці назіранняў апынуліся Нідэрланды – 1 млн 52 тыс. птушак! Самымі актыўнымі па колькасці ўдзельнікаў сталі жыхары Швейцарыі (5334 чалавекі). Наша краіна – на 5-м месцы: 1744 удзельнікі ўбачылі 34 445 птушак 117 відаў.

Якіх крылатых убачым у гэтым годзе – залежыць ад кожнага. Выходзь назіраць за птушкамі разам з намі і ўсёй Еўропай!

Да **EuroBirdwatch-2015** падрыхтаваныя назіральныя пляцоўкі і экскурсіі ў Мінску і іншых гарадах. Абвесткі шукайце на **www.ptushki.org.**

BirdLife EuroBirdwatch15

### Якім чынам прыняць удзел?

Выходзьце на прыроду 3 ці 4 кастрычніка (можна і два дні запар), вызначце віды птушак і падлічыце. Важна паведаміць інфармацыю ў сакратарыят АПБ да 16.00 4 кастрычніка (нядзеля) адным з наступных спосабаў:

- праз анлайн форму на сайце АПБ **www.ptushki.org/formaebw15**;
- дасласць паведамленне ў суполкі АПБ у сацыяльных сетках;
- дасласць паведамленне на адрас **info@ptushki.org**;
- патэлефанаваць на нумары (017) **263-06-13**, МТС (029) **223-06-13**.

Усе, хто будзе весці падлікі ў групах ад трох чалавек і дашле свае назіранні ў час, прымуць удзел у розыгрышы вызначальніка "Птушкі Еўропы".

## 4 кастрычніка – трэці Чэмпіянат Беларусі па фотабёрдынгу!



**Сямён Левы**, супрацоўнік па прыродаахоўных пытаннях АПБ:

– Любіце птушак? Любіце рабіць фотаздымкі? Аб'ядна́йце два хобі можна на чарговым Чэмпіянаце па фотабёрдынгу, які праходзіць у рамках EuroBirdwatch-2015! Пяць гадзін у адным з мінскіх паркаў, непрадказальныя сустрэчы з птушкамі і прадказальна цікавыя людзі! Што трэба рабіць? Сфатаграфаваць як мага больш птушак і паспрабаваць вызначыць іх віды. Пераможцамі стануць тыя, у каго больш фотаздымкаў з вызначанымі відамі птушак. Асобная намінацыя ёсць і для найлепшага мастацкага здымка. Удзельнічаць можна паасобку ці ў камандах па два чалавекі. Дарэчы, прафесійная тэхніка – далёка не галоўны аргумент для "крылатых мадэляў": можна прыходзіць з камерай на смартфоне. У дапамогу вас чакаюць вызначальнікі птушак.

Каго можна сфатаграфаваць? Ад сціплай сінічкі да лунаючага каршуна. Напрыклад, год таму Валерый Кавалёнак сфатаграфаваў на чэмпіянаце ў Лошыцы чорнагаловага рагатуна, што стала першай для Мінска рэгістрацыяй гэтага віду.

Запрашаю вас да ўдзелу, і хай "птушка" з вашага фотаапарата вылятае ў самы патрэбны момант! Падрабязней пазнаёміцца з правіламі ўдзелу і месцам правядзення чэмпіянату можна па спасылцы **www.ptushki.org/photobirding15**.

**Мінулай восенню 53 ўдзельнікі чэмпіянату па фотабёрдынгу сфатаграфавалі ў Лошыцкім парку Мінска 53 віды птушак.**



Берасцянка, Марына Серабракова.
Лепшае фота 2-а Чэмпіяната па фотабёрдынгу


Інфармацыйны бюлетэнь выдадзены ў рамках праекта DCI-NSAPVD / 2012/29208 "Прырода важная для ўсіх. Умацаванне аховы прыроды праз развіццё лідэрства і ўдзелу мясцовага насельніцтва ў працэсе прыняцця рашэнняў на мясцовым узроўні" пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. За змест выдання нясе адказнасць ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны».

# Дикая природа на вашем участке



**Дом – это место, где мы едим, спим, отдыхаем, растим детей. У обитателей дикой природы – такие же потребности: нужно куда-то принести еду, поспать, укрыться от врага и вырастить в безопасности потомство. Давайте дадим им шанс делать то же самое рядом с нами.**

Места, где сохранилась дикая природа, исчезают или изменяются из-за активной деятельности человека. Уменьшается численность шестиногих, восьминогих, безногих и крылатых. Почти у каждого есть участок земли, на котором можно сделать собственный привлекательный для диких животных уголок. Наш разворот бюллетеня посвящен тому, как увеличить биоразнообразие на своем участке. Ведь пень, прудик и куча хвороста – это мелочи для нас, но «многоквартирный дом» для диких животных.

В помощь – советы, как дать природе шанс стать вашим добрым соседом на участке. Не важно, сколько у вас места, времени и материалов: наши советы просты и доступны.

**Пусть природа почувствует, что мы ей рады!**



## Учителю

Учителя могут поэкспериментировать на пришкольном участке вместе со своими помощниками – членами клуба АПБ «Крылатый дозор» или учениками «Зеленых школ», у которых есть похожие задания в программе. Исследуйте пришкольную территорию, найдите, кто уже «прописался» здесь. Для тех, кого встретить не удалось, попробуйте построить убежища и проверить их весной. Пусть дети знают, что жизнь дикой природы во многом зависит от их небезразличия.

## Цветы жизни

Дом для природы начинается с растений. Посадите как можно больше цветущих: они дадут нектар и пыльцу для насекомых. А много насекомых не будет: с «излишками» справятся птицы и звери. Не обязательно покупать дорогие экзотические семена: обменяйтесь с соседями!

Большой «столовой» станут сложноцветные зонтичные и метельчатые растения: у них много мелких цветков, а это кладезь нектара.

Обратите внимание на календарность: важно, чтобы цветущая клумба не только радовала глаз, но и была постоянной «столовой» для насекомых. Весну начинают крокусы, нарциссы, сциллы, разные виды фиалок. Летом эстафету подхватят желтые акации, розы, ромашки, бархатцы, календулы. Осенью для насекомых хороши флоксы, хризантемы, георгины, рудбекия, циния, вереск. И если летом «еды» хватает, то осенью и весной насекомым нужно больше нашего внимания: подготовьте им хорошее «меню» на клумбе!

## Деревья и кусты – дом для дикой природы

Сажайте деревья и кустарники. Результат будет заметен не сразу, но когда они вырастут – станут настоящим оазисом дикой жизни. От самых мелких жуков до птиц и ежей найдут здесь столовую, гостиницу и «детский сад» для своего потомства.

## Не изъяны, а «зеленые коридоры»

Помните, что ваш участок – большой дом для тех, у кого нет сильных крыльев и прыгучих лап. Не ставьте глухие заборы, оставляйте лазейки внизу оград и ворот. Хороший выход – посадка живых изгородей. Все это поможет животным не только свободно пересекать ваш участок, но и обогатит биоразнообразие всей улицы. «Поделитесь» животными с соседями!




## Мертвая древесина – место для жизни!

Не спешите сжигать или выбрасывать ветки, пни и деревья! На гниющей древесине растут грибы, мхи и лишайники. Мертвое дерево – «отель» не ниже 4 звезд для множества насекомых, а еще – хорошая присада для птиц, где их будет легче заметить. Когда обрезаете ветки, не спешите сжигать их: кучи хвороста – любимое место жительства живородящей ящерицы, ежей и других дачных помощников.



## «Коммуналка» для насекомых

Старые доски, ненужные кирпичи, куски черепицы, пучки соломы и тростника, щепки, камни – все это не отходы, а материал для универсального домика для златоглазок, наездников, уховерток, верблюдок и других насекомых. Им придется по душе такой кров!

Если вас пугает внешний вид, можете творчески оформить «коммуналку» цветами и вьющимися растениями, сделать крышу. Еще одно лакомое место для насекомых – поленница дров.



## Водоем: больше воды – больше диких животных!




Пруд на участке – один из лучших способов поселить живность рядом. Даже небольшая лужица – место встреч стрекоз, лягушек, водомерок и тритонов. А еще – водопой и купальня для птиц. Минипруд можно сделать на любом участке. Возьмите тазик/большой вазон для цветов, на дно засыпьте гравий/небольшие камни. Обязательно сделайте пологим один из берегов, чтобы животные могли выбраться. И добавьте растения (к примеру, роголистник). Если у вас большой водоем, следите, чтобы он был мелкий по краям. Это важно для того, чтобы птицы купались, ежики могли выбраться, а лягушки – откладывать икру.

**Важно:** поставьте у дома бочку для сбора дождевой воды. Эта вода очень хороша для наполнения вашего пруда и полива растений.

## Хищные божьи коровки



Не все божьи коровки одинаковы: в Беларуси обитает несколько десятков видов! И более 20 из них могут жить в вашем саду. Эти яркие и милые насекомые – прожорливые хищники, которые едят вредителей сада и огорода. Только представьте: за сутки личинка божьей коровки съедает до 70, а взрослая – до 200 тлей.



**Важно:** продумайте место зимовки для красно-черных помощниц. Божьи коровки зимуют под корой сухих деревьев, в опавших листьях, иногда залетают в дома и прячутся между оконными рамами. Повесьте в саду убежища на зиму – и весной новые поколения божьих коровок снова выйдут на борьбу с тлей.

## Есть пчелы – будет и урожай

Залог хорошего урожая – опыление плодовых деревьев и насекомоопыляемых сортов овощей. Важно, чтобы во время цветения на участке были полезные насекомые. Эффективны осмии (одиночные пчелы). Опылителей можно вознаградить домиками. Они очень простые и при этом стильные: хороший элемент декора на приусадебном участке!








## Варианты домиков для насекомых:

- поленья с просверленными отверстиями
- связка тростника или веток бузины (удалить сердцевину)



## Жабы не претендуют на клубнику

Активные защитники урожая – жабы и лягушки. Они поедают слизней, улиток, личинок насекомых, которыми «брезгуют» птицы. Охота земноводных проходит в сумерки или ночью, когда вредители сада выходят из укрытий.

**Как привлечь:** кроме водоема, подойдет канава с водой или сырые тенистые места. Поставьте или вкопайте неподалеку небольшие глиняные горшочки, которые станут «норкой» для жаб.

**Важно:** амфибии едят животную пищу, и это не они съедают вашу клубнику и землянику! Бывает, что жабы в разгар охоты на сидящего на ягоде слизня нечаянно откусывают вместе с вредителем кусочек ягоды, что и дает повод для ложных обвинений.

## Ящерица разберется с медведкой, уж – с грызунами



В «меню» ящериц – много вредителей сада: медведки, мухи, гусеницы, а в голод – даже колорадские жуки. Они приходят в огород, чтобы съесть их, а не укусить вас: не бойтесь. То же самое нужно сказать и про змей: самый частых дачный гость – уж. Он будет рад помочь вам избавиться от грызунов.

Излюбленные места обитания – пни, кусты, компостные ямы. Выделите рептилиям хотя бы уголок.

## Ежи – есть, улиток – нет

Если на даче живут ежи – вам не грозят полчища улиток и слизней, и ваш дом будет избавлен от набегов грызунов. Молоко и ломтики сыра – хорошие приманки для ежа. А потом он отправится на охоту на улиток, слизней и грызунов.

Для колючего помощника можно поставить небольшие домики в кустах: они станут или местом жительства, или временным укрытием. А еще оставьте до весны кучи осенних листьев: это хорошее место для зимовки ежей.

## Домики для летучих мышей: недолго, несложно и важно!

Эти зверьки работают «в ночную смену», причем с впечатляющим темпом поедания: вес «лакомства» может быть равен половине собственного веса.

Если рукокрылые расположились у вас на чердаке – примите таких соседей. Также для летучих мышей можно сделать домик и повесить в саду. Жилищный вопрос для них острый: они не строят убежищ сами.

Материалы для домика: неструганная доска длиной в 1.5 м и 12-25 саморезов. На всех внутренних стенках нужно сделать горизонтальные пазы, чтобы дать возможность летучим мышам зацепиться (они отдыхают, вися вниз головой). Пазы можно пропилить пилой или стамеской (глубина – несколько миллиметров). Используйте необработанную древесину.

Крыша (A) – 250 х 160 х 20 мм
Задняя станка (B) – 450 х 200 х 20 мм
Центральная стенка (C) – 330 х 200 х 20 мм
Передняя стенка (D) – 210 х 200 х 20 мм
Центральная перегородка (E) – 330 х 20 х 20 мм (нужно 2 шт)
Передняя перегородка (F) – 210 х 15 х 15 мм (нужно 2 шт)
Подпорка – 200 х 20 х 20 мм (не обязательно)




**Где повесить?**
На стволе дерева или стене.
Из особенностей – на солнечной стороне.
Чем выше домик – тем лучше (3-6 м).
Для крепления подойдет проволока или металлический трос.

## Птицы: заселить, кормить и купать

**Заселить**

«Птицы» и «гусеницы» – слова-антонимы в вашем саду. Большие синицы, лазоревки, мухоловки, трясогузки – в благодарность за скромный домик эти насекомоядные птицы соберут тысячи гусениц и других вредителей сада, чтобы прокормить свое потомство, а вам оставить целехонький сад фруктов.

**Кормить**

Зимой не ленитесь вешать кормушки: одна такая «столовая» спасет от холодной и голодной смерти десятки птиц! Кормушку можно купить или сделать самому из пластиковой бутылки. Долго прослужит и деревянная кормушка (важно делать небольшие летные отверстия, чтобы залетали только мелкие воробьиные птицы). Во время трапезы можно понаблюдать за пернатыми и сделать хорошие фото. На кормушках можно встретить воробьев, больших синиц, лазоревок, зеленушек, снегирей, дятлов, соек, дубоноса и других зимующих птиц. Лучшая еда для них – семечки и сало. Все это – сырое и несоленое. И никакого хлеба и батона!

**Купать**

Летом у птиц достаточно корма, поэтому пока кормушка отдыхает в кладовке – время обустроить поилку для них. Если у вас нет водоема, то установите в тихом месте возле кустов таз или другую емкость с водой, где птицы смогут пить и купаться в зной. Сделать поилку так просто и так важно!



**Эти советы сделают ваш уголок привлекательным для наших жужжащих и шуршащих соседей. Несколько простых действий – и участок превратится в оазис дикой жизни. Теперь на вашей фазенде "пропишутся" десятки жуков, шмелей, птиц и божьих коровок, которые станут вашими верными помощниками в огородных делах. Начните – и увидите сами! Обязательно делитесь своими успехами, присылайте фото и истории на info@ptushki.org.**

На подготовку публикации нас вдохновила кампания «Give nature a home», которую проводит Королевское общество защиты птиц (RSPB).

rspb giving nature a home

Использованы фотографии: Л.Майден, Т.Кейлор, М.Паррот, В.Покидько, Л.Коновалов

## Зязюля-зязюля, колькі...?



Якім 2015 год выдаўся для нашых зязюль з спадарожнікавымі перадатчыкамі – удзельніц міжнароднага праекта спадарожнікавага сачэння за птушкамі.

Да восені жывымі засталіся чатыры птушкі (36%): на трэці круг пайшоў Віктар, а таксама адлоўленыя ў мінулым годзе Ігар, Вікторыя і Аляксандр.

Астатнія 11 зязюль у розны час перасталі выходзіць на сувязь. Прычыны магчымы розныя – ад няспраўнасці перадатчыка да пагібелі. Падобная сітуацыя назіраецца сярод нямецкіх і брытанскіх зязюль, якія таксама ўдзельнічаюць у праекце: статус "актыўных" застаецца ў чатырох птушак з 10 (40%) і 16 птушак з 55 адпаведна (29%).

Вясной крыху апярэдзіў астатніх **Ігар**, які **падаў першы сігнал з тэрыторыі Беларусі 19 красавіка**. Самыя нечаканыя сігналы падчас міграцыі прыходзілі ад Аляксандра: па раней небывалым для зязюль з Беларусі маршруце ён даляцеў да Іспаніі, а потым у паскораным тэмпе перасек Францыю, Італію, Аўстрыю, Славакію, Польшчу, Украіну і нарэшце апынуўся на Радзіме. Здзівіла і Вікторыя: птушка вярталася ў Беларусь праз Маёрку, Італію, Аўстрыю, Чэхію і Польшчу.

Дома зязюлі пабылі нядоўга. Відаць, хутка знайшлі "прыёмных бацькоў" для сваіх дзетак і ўжо ў пачатку ліпеня ўсе, акрамя адной, пакінулі межы нашай краіны.

**У Беларусі зязюлі кукавалі практычна ў тых жа мясцінах, як і год-два назад, дзе атрымалі перадатчыкі** (большай часткай у радыусе ўсяго 50 км). Праект працягваецца, і, напэўна, птушкі падрыхтуюць нам яшчэ не адзін сюрпрыз. Сачыце за зязюлямі на сайце АПБ у раздзеле "Куды ляцяць беларускія зязюлі" – **www.ptushki.org/cuckoo**

**Андрэй Барадзін**, валанцёр АПБ

Праект рэалізуецца пры падтрымцы Брытанскага арніталагічнага фонду (BTO) і Баварскага таварыства ахоўы птушак (LBV)

## Спаси орленка!



С таким призывом АПБ обратилась ко всем друзьям дикой природы и с конца мая начала акцию по сбору средств на спасение глобально угрожаемого вида – большого подорлика. Благодаря вам в 2015 году работы по мониторингу успеха размножения впервые были проведены за пожертвования. Мы получили около 20 миллионов рублей от 107 человек. Спасибо всем, кто помог!

Удалось организовать две экспедиции на Полесье, найти и проверить 18 гнездовых территорий, окольцовано 4 птенца. Отмечено, что несколько пар переместились в связи с возросшей около гнезд хозяйственной активностью. АПБ направила письма землепользователям по исправлению ситуации. На счету – каждая птица, каждое гнездо, когда в Беларуси осталось всего чуть больше 100 пар этого болотного орла.

Акция продолжается, сейчас идет сбор средств на важный осенний этап – постройку искусственных гнезд. Большие подорлики живут у низинных болот, где небольшой выбор подходящих для гнезд деревьев, да и те неустойчивы. Мы могли бы помочь птицам и подготовить «новостройки»! Узнать больше и присоединиться можно здесь – **www.ptushki.org/spottedeagle**

**За пожертвование в 200 000 и более рублей АПБ высылает сертификат-благодарность «Спаситель орленка». Такие сертификаты получили 30 человек.**

## Птицы и закон



"Птицы в беде". Новостям на сайте АПБ, помеченным этим тегом, радоваться не приходится: почти каждую неделю мы получаем сообщения о том, как птицы становятся жертвами необдуманных поступков людей. Как наша организация реагирует на такие сообщения и что делает для того, чтобы ситуация не повторилась? О некоторых случаях рассказывает Тимофей Пико, сотрудник АПБ по природоохранным вопросам.

## Грачи на проволоке

**Начало мая, Малорита. В центре внимания – грачи. Коммунальные службы обрезали деревья в парке (ул. Несенюка и Парковая) в установленные сроки, что не было нарушением. Но в скором времени местные жители заметили, что на обрезанных деревьях висят мертвые грачи! Трупы были подвешены к веткам за лапы проволокой.**

– Это беспрецедентный случай в нашей практике. АПБ обратилась в Минприроды и Малоритский городской исполнительный комитет, чтобы расследовать причины гибели птиц и рассмотреть факт жестокого обращения с дикими животными. После проверки Брестского областного комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды оказалось, что работники КУМПП «Малоритское ЖКХ» таким образом решили отпугнуть грачей от мест их постоянного гнездования. Это очень негуманно, а кроме того опасно с эпидемиологической точки зрения, ведь мертвые животные разлагаются.

Об этом никто из работников ЖКХ не подумал. Как и не подумали о том, что мертвые грачи не отпугнут живых: возле птичьих трупов наблюдалось гнездовое поведение птиц.

Несмотря на долгое разбирательство, оснований для начала административного процесса за жестокое обращение с животными Брестский областной комитет не нашел. Мертвые грачи были сняты с деревьев, новость разошлась по более чем 30 СМИ. Остается надеяться, что остальные будут научены этим печальным примером.

Если вы стали свидетелем жестокого обращения с птицами или видите, что ситуация к тому идет – не проходите мимо, сообщайте в местные инспекции природных ресурсов и охраны окружающей среды или в АПБ. Помните: один из главных принципов нашего общества – гуманность. А в гуманном обществе нет места жестокому обращению с животными.

## Уборка «по-фанипольски»

**Середина мая, звонок из Фаниполя: сбивают гнезда грачей с птенцами. Машина с подъемником, кружащие и кричащие над деревьями родители-грачи и разбросанные по земле мертвые птенцы – вот такая утренняя картина.**

– На место сразу же выехали сотрудники АПБ, представители Минской областной и Дзержинской районной инспекций Минприроды, корреспонденты двух телеканалов. И хоть нарушители к нашему приезду свои следы постарались спрятать, местные жители сделали много фотографий и записали номер автоподъемника. Хотя колония грачей под окнами им изрядно досаждала, они были категорически против таких радикальных незаконных действий по ее уничтожению. По самым скромным оценкам, убито около 30 птенцов. Обрезка деревьев и уничтожение гнезд согласно ст. 19 Закона «О животном мире» разрешены с 16 октября по 15 апреля, когда гнезда птицами не заселены. Статьей 15.32 Кодекса Республики Беларусь об административных правонарушениях **за подобные действия установлено наказание в виде штрафа в размере до 20 базовых величин, а на юридическое лицо – до 200 базовых величин.** Кроме того, уничтожение грачей – это причинение окружающей среде вреда. **За каждую незаконно изъятую особь также придется заплатить 6 базовых величин.**

Все полученные материалы были переданы в Дзержинскую районную инспекцию природных ресурсов и охраны окружающей среды. Виновником оказалась частная строительная фирма, которая таким образом пыталась облагородить территорию.

## Чайки-хохотуньи, которым не до смеха

**Поселок Гатово возле Минска прославился своими чайками. Крышу кожевенного комбината облюбовала большая колония чаек-хохотуний. Слетки выходят из гнезд и начинают свое знакомство с миром прямо на автодороге с интенсивным движением. Многие птицы не увидели в своей жизни больше ничего, погибнув под колесами.**

– АПБ обратилась в ГАИ Минского района. Нам пошли навстречу, принято решение обозначить проблемный участок дороги знаком «ограничение скорости». Так что следующей весной дорога не будет так опасна для птиц. Эта мера важна и для водителей: птица крупная, если человек ее увидит на дороге – может начать резко тормозить, вывернет руль не туда, съедет в кювет. Так что ограничение скорости сделает этот участок дороги безопаснее для всех.

## Birdrace-2015: як "Цмокі" 112 відаў птушак бачылі

12 каманд. 12 гадзін. 112 відаў у пераможцаў – на гэтым магія лічбаў 12-га Чэмпіянату па спартыўнай арніталогіі не скончылася. Таямнічасці спаборніцтвам, што адбыліся 5 верасня, дадаваў туман і не самае "птушынае" надвор'е. За плячыма каманд засталіся пяць абласцей краіны, дзевяць рыбгасаў і яшчэ 20 азёр. У выніку ў няпростых умовах і няпростай барацьбе перамагла каманда "Цмокі" (на фота злева направа: Дз. Харковіч, Дз. Табуноў (капітан), Ю. Янкевіч, І. Багдановіч), якая стартавала ў Баранавічах. На другім месцы – каманда "Пагоня" (С. Левы (капітан), А. Журавель, В. Фянчук, В. Кашчэеў), на трэцім – "Rara avis" (М. Каласкоў (капітан), І. Самусенка, Дз.Жураўлёў, В. Лукшыц).



Падчас гонкі лідары змяняліся чатыры разы. Самым хуткім стартам запомнілася каманда "Rara avis": першыя 50 відаў – усяго за 1 гадзіну і 37 хвілін. Час ад часу іх падцісkалі "Цмокі" і "Пагоня". У 14.52 на першае месца выйшлі "Цмокі" і здолелі ўтрымаць лідарства да канца.

Мяжу ў 100 відаў пераадолелі пяць каманд, яшчэ чатыры набралі больш за 90 відаў. У суме ўсе каманды адзначылі 174 віды птушак (на два менш, чым у 2014 годзе).

Самымі рэдкімі відамі чэмпіянату прызнаны канюх-курганнік (адзначыла і сфатаграфавала каманда "P.S." у рыбгасе "Навінкі" Пастаўскага раёна) і пярэстая качка (чатыры асобіны на рыбгасе "Сялец" адзначыла каманда "Parus"). Вушатую саву – птушку 2015 года – бачылі толькі "Палескія вушасцікі". Мабыць, дапамагла назва!

Дзякуй усім за цікавую гонку! Наперадзе – амаль год, каб палепшыць сваё майстэрства і сабраць сваю каманду на Birdrace-2016. Убачымся!

**Ахова птушак Бацькаўшчыны**

АПБ з'яўляецца нацыянальным партнёрам BirdLife International, глабальнай асацыяцыі прыродаахоўных арганізацый

BirdLife INTERNATIONAL

© АПБ, 2015 Інфармацыйны бюлетэнь ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны",
Галоўны рэдактар: Аляксандр Вінчэўскі
Рэдакцыйная калегія: Віктар Фянчук, Аляксей Цішачкін, Ганна Трафімчук, Вікторыя Церашонак, Мікалай Чэркас, Алег Кальчанка,
Карэктар: Надзея Вішнеўская
Верстка: Міхаіл Пракапенка

№ 2 2015 год
Рэгістрацыйны №726 ад 12.10.2009 г. Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Наш адрас: © АПБ, 220114, вул. Парніковая 11, пам. 4, Мінск, Беларусь
Тэл. (017) 263 06 13
Факс (017) 265 08 11

(029) 223 06 13 МТС, (029) 101 68 87 (velcom).
E-mail: info@ptushki.org
Сайт: www.ptushki.org

Дзейнасць ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны" падтрымліваецца Каралеўскім таварыствам аховы птушак (RSPB), партнёрам BirdLife International у Вялікабрытаніі.

Наклад паас.
Перадрук дазваляецца пры ўмове спасылкі на Інфармацыйны бюлетэнь
Замова №